**Вольга ШАЎКО.**
***(Працяг будзе).***

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

## АХОВА ПРАВАПАРАДКУ — У НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ

**Мужчына-мінчанін, што пражывае ў Фрунзенскім раёне сталіцы, звярнуў увагу на наступную акалічнасць, якой і падзяліўся па «гарачай лініі». «Побач са станцыяй метро «Каменная Горка» пэўны час існуе імправізаваны рынак па продажы сельгаспрадукцыі. Жыхары навакольных вёсак, шчыра скажам, гандлююць сваёй садавінай і гароднінай, як кажуць, непасрэдна з асфальту. Тут жа можна сустрэць і «цьмяных» асобаў з заморскімі вітаміннымі прысмакамі. Ды сутнасць не ў тым. Усіх гэтых гандляроў перыядычна ганяе міліцыя. І вось некалькі дзён запар я бачу, што такую простую ролю, якую можа выканаць звычайны міліцыянер, выконваюць спецназаўцы, як вынікае з бэджыкаў на грудзях. Хлопцы ў берцах, апранутыя ў спецыяльную камуфляжную форму і ў крапавых берэтах. Паводзяць сябе з бабулькамі тактоўна, але пытанне ў іншым. Чаму такіх прафесіяналаў адправілі выконваць такую функцыю? А калі недзе адбудзецца сур'ёзнае злачынства?»**

Як паведаміў інспектар аддзела кадраў палка міліцыі спецыяльнага прызначэння (колішні АМАП) Павел КАЛАМЫЦЫН, нічога дзіўнага ў тым, што супрацоўнікі палка міліцыі прымаюць удзел у ахове грамадскага правапарадку, няма.

— Другі тыдзень у горадзе ідзе акцыя «Дабрабыт». Па ўсіх раёнах горада ва ўзмоцненым рэжыме працуюць нашы нарады, яны дапамагаюць патрульна-паставой службе. Гэта будзённая праца, гэтак жа сама нашых супрацоўнікаў можна ўбачыць і пры нясенні службы па ахове правапарадку ў іншых грамадскіх месцах, напрыклад, пры правядзенні масавых мерапрыемстваў, — сказаў Павел Анатольевіч. — Звычайна ў супрацоўнікаў чорныя берэты, але, відавочна, вашаму заяўніку на вочы трапіў нарад, у складзе якога былі адразу два «крапавікі». Вы ведаеце, што права насіць гэты галаўны ўбор трэба заслужыць, але потым супрацоўнік мае права яго нашэння на паўсядзённай службе.

Далей суразмоўца дадаў, што ў выпадку ўзнікнення праблемнай сітуацыі найбліжэйшы пешы нарад павінен прыбыць да месца здарэння за сем хвілін. Акрамя таго ў раёнах горада працуюць патрулі на аўтатранспарце, увесь час падтрымліваецца сувязь па рацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Пытальнік

# Вясёленькі халадзільнік? Ды без праблем!

***Цяпер мы рамантуем сваю кватэру. Паралельна з гэтымі работамі вырашылі з мужам аздобіць інтэр'ер нечым незвычайным. Паколькі будзем усталёўваць новую кухню, мне захацелася памяняць і халадзільнік. Хачу новую сучасную мадэль. Прычым, не белую, як звычайна, і нават не колеру «металік». Хочацца нечага вясёленькага! Я недзе чула, што такую паслугу робяць: перафарбоўваюць халадзільнік у любы колер па жаданні кліента. Муж і сяброўка з мяне смяюцца, маўляў, выдумляй болей, што прадаецца ў крамах, з таго і выбірай.***

**І.К.,** *пасёлак Прывольны Мінскага раёна*

На жаль, наша чытачка не ўдакладніла, які халадзільнік яна хоча набыць — імпартны або айчынны. Бо такая паслуга па перафарбоўванні сапраўды існуе і робіць яе ахвотным гарантыйная майстэрня ЗАТ «Атлант» (што размешчана ў сталіцы па вуліцы Ціміразева, 15), аднак толькі ў дачыненні да прадукцыі свайго прадпрыемства. Мы патэлефанавалі ў майстэрню, каб даць заяўніцы больш падрабязны адказ.

Як патлумачылі нам яе работнікі, у сярэднім кошт паслугі складае каля 250 тысяч рублёў (уплываюць канкрэтныя памеры халадзільніка або маразільніка), тэрмін выканання — два тыдні. Перафарбаваць могуць як абсалютна новы «Атлант», так і былы ў карыстанні. У апошнім выпадку, калі агрэгат знаходзіцца дома ў грамадзяніна, яму давядзецца самому везці яго ў майстэрню. Калі гаворка ідзе пра новы халадзільнік, толькі набыты ў гандлі, тут магчымы варыянты. Пры набыцці гэтай складанабытавой тэхнікі ў фірмовай краме ад прадпрыемства (салон-крама знаходзіцца ў Мінску па адрасе: праспект Пушкіна, 14), у майстэрню халадзільнік для перафарбоўвання даставяць бясплатна. А калі ўпадабаная мадэль была набыта ў любым іншым гандлёвым прадпрыемстве? «Давядзецца дамаўляцца адносна даставкі або з гэтай канкрэтнай крамай, або зноў жа везці яе да нас самастойна», патлумачылі работнікі майстэрні. З пакупніком у абавязковым парадку заключаецца дагавор на паслугу па перафарбоўванні. Пры неабходнасці яму могуць быць зроблены дызайнерскія паслугі, спецыялісты падкажуць, як лепш «упісаць» новы колер у інтэр'ер кухні. У іншы (адзін) колер можна перафарбаваць цалкам увесь выраб, а можна задзейнічаць і некалькі розных колераў (напрыклад, для вылучэння канструктыўных элементаў — ручак, дэкаратыўнага шчытка). Якія колеры можна выбраць кліенту? На жаль, на момант нашага звароту ў майстэрню гэты выбар быў абмежаваны толькі трыма колерамі: салатавым, зялёным і «металік». Насамрэч каляровая гама ў іншыя часы куды больш багацейшая, да вышэйназваных колераў можна дадаць, напрыклад, яшчэ сіні колер, жоўты, аранжавы, карычневы, рубінавы.

Дарэчы, для аматараў рабіць усё сваімі рукамі: перафарбаваць халадзільнік ці маразільнік можна паспрабаваць самому. Спатрэбяцца вольны час, жаданне, наждачная папера і балончык аўтамабільнай фарбы. Зачышчаную ад колішняй фарбы металічную паверхню (пластыкавыя і гумавыя часткі або здымаюцца, або закрываюцца), абястлушчваюць якім растваральнікам і — наперад з балончыкам фарбы. Адно, гэты працэс пажадана праводзіць або на вуліцы, або, калі ў жыллі, хоць бы падчас капітальнага рамонту, бо чыстым яго не назавеш. Як мы пісалі падчас наведвання адной сталічнай будаўнічай выставы, ёсць у сталіцы і фірма, якая возьмецца аздобіць любую вашу бытавую тэхніку ці звыклыя прадметы інтэр'еру (газавую пліту, ЗВЧ-печ, кухонны гарнітур, дзвярны званок ці дамафон, той жа халадзільнік і г.д.) практычна любым натуральным ці штучным матэрыялам — ад скуры да бронзы. Праўда, і «цана пытання» будзе адпаведнай, у залежнасці ад выбраных матэрыялаў, і гэтую тэхніку давядзецца самастойна завозіць-прывозіць.

# Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

Доктар адкажа

**Да канца месяца дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**24 жніўня** — галоўны ўрач Мінскай абласной клінічнай бальніцы **Юрый Мікалаевіч ЛАДУЦЬКА**;

**25 жніўня** — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» **Маргарыта Іванаўна БЕЛЬСКАЯ**;

**26 жніўня** — дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» **Канстанцін Усцінавіч ВІЛЬЧУК**;

**27 жніўня** — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі **Анатоль Сяргеевіч МАЎРЫЧАЎ**;

**28 жніўня** — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра дзіцячай анкалогіі і гематалогіі **Аксана Мікалаеўна РАМАНАВА**;

**31 жніўня** — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя **Уладзімір Мікалаевіч СКЛЕМА**.

***У графіку магчымыя змяненні.***

Інфарм-укол

## Выбар знясільвае

**Выбар, які ў прынцыпе дазваляе нам адчуваць сябе свабоднымі і незалежнымі, мае адваротны бок. Ва ўсякім выпадку, псіхолагі ўніверсітэта Мінесоты (ЗША) пацвердзілі меркаванне аб тым, што неабмежаваны выбар ускладняе жыццё і знясільвае нашы рэсурсы.**

Аказалася, тым, хто вымушаны пастаянна выбіраць, складаней засяродзіцца на паўсядзённых задачах. Паддоследныя, якія павінны былі па ўмовах эксперыменту прыняць рашэнне і выбраць штосьці з велізарнага асартыменту прадуктаў і паслуг (у адрозненне ад тых, хто толькі абмяркоўваў варыянты пакупак), далей, пры вырашэнні простых задачак, часта памыляліся, ім было цяжэй засяродзіцца. Псіхолагі мяркуюць, што неабходнасць пастаяннага выбару трымае наш мозг у напружанні і ў нейкім сэнсе знясільвае яго незалежна ад таго, вымушаны выбар ці добраахвотны. І раяць адмаўляцца ад пакупкі аднаразовых прадметаў, складаць спіс неабходнага да паходу ў краму і імкнуцца пазбягаць параўнанняў з іншымі людзьмі.

## Даверыць бабулі самае-самае

**68 працэнтаў англійскіх дзяцей прыслухоўваюцца да парадаў бабуль і дзядуляў, кожнае трэцяе дзіця давярае ім свае тайны, а 75 працэнтаў хочуць менавіта з імі абмяркоўваць сваю будучую адукацыю і работу.**

Даследчыкі з Оксфардскага ўніверсітэта (Вялікабрытанія) упэўнены ў пэўным пазітыўным уплыве такіх стасункаў на псіхічнае развіццё дзяцей. Старэйшы сваяк, з якім можна спакойна пагаварыць аб самым важным, робіць жыццё дзіцяці камфортным і дорыць адчуванне дабрабыту і бяспекі.

## Калі мужчын і жанчын — 50/50

**Чым менш жанчын у рабочым калектыве, тым вышэйшая рызыка сэксуальных дамаганняў з боку мужчын. Гэта меркаванне аспрэчылі сацыёлагі ўніверсітэта штата Агаё (ЗША).**

Вучоныя ўзялі на кантроль калектывы 110 кампаній колькасцю ад 30 да 5000 чалавек. Яны назіралі за адносінамі работнікаў і фіксавалі факты сэксуальных дамаганняў (не толькі ўласна прамое прымушэнне, але і звычайную «апеку»). Высветлілася: жанчыны часцей падвяргаюцца сэксуальным дамаганням, калі ў калектыве пароўну мужчын і жанчын. Тлумачыцца гэта тым, што ў сэксуальна збалансаванай камандзе больш магчымасцяў для рэгулярных і разнастайных кантактаў паміж разнаполымі супрацоўнікамі. Аказалася таксама, што чым вышэй пасада, якую займае жанчына, тым большай рызыцы сэксуальнага пераследу яна падвяргаецца.

## Час здрады для жанчын

**У апошні тыдзень перад менструацыяй і першыя 7-10 дзён з пачатку месячных сэксуальнае жаданне блізкае да нуля.**

Жанчын у гэты перыяд хвалюе толькі ежа. Шмат ежы! У асноўным салодкай, каб заесці дрэнны настрой — вечны спадарожнік перадменструальнага сіндрому. Хоць некаторых цягне і на салёненькае. Атрымлівайце асалоду ад ежы: лішнія калорыі не паспеюць «прыжыцца». На піку месячных вы ўжо не будзеце са сквапнасцю рыскаць па халадзільніку, а тое, што ў ім засталося, акуратна раскладзяце па палічках: у крытычныя дні жаданне навесці парадак становіцца маніякальным. Яно ўзнікае на падсвядомым узроўні: у гэты час мы асабліва дасканала сочым за чысцінёй. Затое ў сярэдзіне цыкла вас ужо не будуць хваляваць ні горка посуду ў ракавіне, ні мужчынскія шкарпэткі ля ложка. Сэкс перш за ўсё! Не выпадкова большасць здрадаў адбываецца менавіта ў сярэдзіне цыкла. Англійскія вучоныя даследавалі 5000 замужніх англічанак ва ўзросце 30—40 гадоў і выявілі, што кожнае дзявятае дзіця нараджана не ад законнага мужа. Паддоследныя прызналіся, што пайшлі налева акурат у перыяд авуляцыі.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ВАДЗІЦЕЛЬСКІ ХЛЕБ

**— Пад'ём а палове чацвёртай. «Дзяжурка» прывозіць у парк, праходзіце медагляд, бераце дарожную дакументацыю, правяраеце аўтобус, выязджаеце на лінію... У канцы змены — ізноў праверка аўтобуса, яго запраўка, затым едзеце на мыйку...**

Прыблізна так абмаляваў працоўны дзень звычайнага вадзіцеля **намеснік генеральнага дырэктара ТКУП «Мінсктранс» Уладзімір КАНОПЧАНКА.** — Вы не думайце, што праца вадзіцеля — гэта проста. Гэта — пастаянныя фізічныя і псіхалагічныя нагрузкі. Яна патрабуе ад вадзіцеля цягавітасці і здароўя...

Пра асаблівасці і спецыфіку працы вадзіцеляў гарадскіх аўтобусаў я выпытваў не выпадкова. Кожны дзень слухаю, як бабулькі ў аўтобусах «палошчуць» кіроўцаў, асуджаючы за тое, што аўтобус спазніўся, што едзе ён марудна…

Сам не раз быў сведкам тыповых сітуацый: то гонімся, як на той «Формуле-1», то паўзём, быццам на чэмпіянаце сярод чарапах. Але найчасцей згадваеш вадзіцеля добрым словам, калі аўтобус тармозіць, а ты разам з усімі моцна б'ешся галавой аб поручань...

Я выправіўся ў сталічны аўтобусны парк № 5…

## Ад Жданоў і да Вяснянкі

Пяты філіял ТКУП «Мінсктранс» — самы вялікі ў горадзе. Некаторыя нават лічаць, што ён і ва ўсім СНД дасць фору любому па кольгасці тэхнікі і тэхнічнага персаналу. Тут 416 адзінак рухомага саставу, якія забяспечваюць 40 гарадскіх, 93 прыгарадныя і 18 міжнародных маршрутаў. Адных кандуктараў тут працуе 200 чалавек, а вадзіцеляў — 800.

— Мы абслугоўваем такія мікрараёны, як Малінаўка, Сухарава, Захад, Кунцаўшчына, Вяснянка, Ждановічы і Дружба, — распавядае **першы намеснік дырэктара аўтобуснага парка № 5 Эдуард ЧАБРОЎСКІ.** — Гэта вельмі шмат у параўнанні з іншымі філіяламі парка.

Пытаюся ў Эдуарда Часлававіча пра найбольш частыя скаргі пасажыраў і не здзіўляюся: людзі незадаволеныя графікам руху. Асабліва ў зімовы перыяд.

— Для пасажыраў розніцы няма, па якой прычыне спазніўся аўтобус. — працягвае спадар Чаброўскі. — Толькі часта пасажыры і не разумеюць, што якраз праз іх аўтобус, і спазняецца. Вось уявіце, што б мы мелі, калі б кіроўца не прадаваў талончыкі і не чакаў пасажыраў, якія пастаянна дабягаюць да аўтобуса?..

## Ой, пайду я лугам-лугам

У рэйс мы выязджалі ўтраіх: кіроўца, кандуктар і я. Мне выдалі скураны зэдлік (пабочных асобаў у кабіне быць не павінна, але для журналіста-«стажора» зрабілі выключэнне), ля шкла прымацавалі шыльду «Стажор» і пажадалі ўдачы.

— Як бы ні быў прывязаны да аднаго маршруту, а часам даводзіцца працаваць і на іншым, — прызнаецца мой **напарнік Аляксандр КУЦЬКО.** — Учора на 84-м маршруце, пазаўчора — на 81-м, а сёння вось — на 130-м...

Аляксандр націскае некалькі лічбаў на адмысловым прыборы і — звонку на аўтобусе бачныя электронныя нумар і надпіс нашага маршруту: 130, «д/с Адоеўскага — г/д Ждановічы». Каб даехаць ад аднаго канцавога прыпынку да другога і вярнуцца назад, трэба паўтары гадзіны...

— У нашай працы галоўнае — настрой, — працягвае Аляксандр. — Усё залежыць ад таго, з якімі пачуццямі ты выязджаеш у рэйс. Калі ў цябе ўсё выдатна, пасажыры таксама гэта адчуюць. І змена пройдзе лёгка. У гэтай працы няма дробязяў, пастаянна трэба быць пільным. Спознішся на 30 секунд і ў графік не трапіш.

Вадзіцелем Аляксандр стаў па ўласным жаданні. Пасля школы адвучыўся ў парку і пайшоў працаваць на аўтобус. Відаць, прызванне такое: з 43 чалавек, што вучыліся разам з ім, толькі сямёра скончылі навучанне. Астатнія сышлі, цяжка.

— Тады абы-каго не бралі. Тады конкурс быў, — з настальгіяй успамінае Аляксандр. — Так і працаваў. Пасля — развал Саюза, усё змянілася. Вырашыў паспытаць шчасця дальнабойшчыкам. Там, калі даведаліся, што я былы «аўтобуснік», з рукамі і нагамі ўзялі. Людзей жа вазіў...

Але праз пэўны час Аляксандр вырашыў вярнуцца. Сёння ён зноў за баранкай, а яго вадзіцельскі стаж пераваліў за 20 гадоў.

## Пасажыр мае рацыю?

— Галоўнае пры пад'ездзе да прыпынку — правільна спыніцца. Каб у бакавым люстэрку былі бачныя ўсе дзверы аўтобуса. Асабліва ўважлівым трэба быць з апошнімі дзвярыма: яны найбольш небяспечныя. Калі хвост аўтобуса заносіць і ты не бачыш яго ў люстэрку, то рызыкуеш каго-небудзь прышчаміць, — праводзіць лікбез Аляксандр, паказваючы на роўную лінію аўтобуса ў бакавым люстэрку.

Хто такія «дабягаючыя пасажыры» я таксама пазней зразумеў. Асабліва шмат іх на прыпынках побач з метро і падземнымі пераходамі.

Тыповая сітуацыя: прыпынак — зайшлі пасажыры, дзверы можна зачыняць. Але тут, як з-пад зямлі, з пераходу выскачыць якая-небудзь кабета з трыма торбамі: «Стой! Стой!»

Тут два варыянты: калі такія кабеты не дабягуць, пакрыўджаныя, яны ідуць і пішуць на кіроўцу скаргу: «Во гад! Паехаў, а не пачакаў!». Калі ж жанчыне пашанцуе і яна з горам напалову залезе ў аўтобус, то сюрпрыз будзе чакаць кіроўцу на наступным прыпынку. Бо там будуць бурчэць ужо іншыя пасажыры: аўтобус прыехаў на тры хвіліны пазней.

Для кантролю графіка руху на многіх прыпынках усталяваныя адмысловыя прыборы з шыльдай «Тэхнічны прыпынак». Калі аўтобус пад'язджае да гэтага месца, кіроўца націскае кнопку і атрымлівае сігнал — аўтобус адзначыўся. Можна ехаць далей. Паралельна кіроўца даведваецца, ці не выбіўся яго аўтобус з графіка, а калі так, то на колькі хвілін.

— Зразумела, можна, як звар'яцеламу, цiснуць на газ. Ляцець стралой, жадаючы нагнаць такім чынам страчаны час. Ехаць будзеш хутка, аўтобус будзе падскокваць на выбоінах — пасажыраў будзе трэсці... Я ў такім выпадку стараюся не панікаваць. Спакойна даязджаю да канцавога, а ўжо там, калі спазняюся на дзве хвіліны, то проста на дзве хвіліны раней буду выязджаць.

Яшчэ адна важная дэталь: як вадзіцель тармозіць. Калі людзі падаюцца ўперад, значыць кіроўца затармазіў рэзка. Каб гэтага пазбегнуць, трэба ехаць плаўна. А стажораў правяраю звычайна так: стаўлю ў кабіну шкляначку, напоўненую вадой. Вада пралілася — экзамен не здаў. Ні кроплі — малайчына.

## Пра аўтобусную кішэню і культуру

— Яшчэ адна вельмі важная праблема — гэта месцазнаходжанне навесаў і лавак для чакання транспарту, — абураецца Аляксандр. — На большасці прыпынкаў яны размешчаны далёка ад дарогі. Аўтобус жа павінен спыняцца ў канкрэтным месцы, для гэтага існуюць адмысловыя аўтобусныя кішэні. Калі да навеса 10 метраў, то, вы-бачайце, колькі часу спатрэбіцца пажылой жанчыне, каб да аўтобуса дайсці? Прыпынкі правакуюць канфлікт, яны недапрацаваныя. Пасля толькі скаргі на кіроўцу: не так пад'ехаў. А як тут пад'едзеш, калі альбо месца больш няма (таксі стаіць наперадзе), альбо навес за кіламетр?!

Па праўдзе, Аляксандр сапраўды меў рацыю: з усіх прыпыначных пунктаў, ля якіх мы спыняліся, толькі некаторыя былі зручнымі — на астатніх навесы і лаўкі знаходзіліся далекавата да аўтобуснай кішэні.

Наперадзе чарговы прыпынак, а нам... няма дзе спыніцца. Маршруткі.

— Гэта яшчэ адзін біч сённяшніх дарог. Безкультур'е вадзіцеляў. Ёсць, праўда, і спрактыкаваныя кіроўцы. Амаль заўсёды па тым, як рухаецца аўтобус ці машына, можна вызначыць, хто сядзіць за рулём: чалавек дасведчаны ці навічок. Маладыя звычайна як: учора атрымаў правы, а сёння ўжо на маршрутцы працуе... Ні цярпення, ні культуры, ні вытрымкі. Падразаюць, бесцырымонна заязджаюць на прыпынкі перад носам аўтобуса. Людзі перабягаюць дарогу, парушаюць правілы. Я ўвогуле — за тое, каб для грамадскага транспарту асобную паласу выдзелілі.



...Мы едзем па вуліцах Мінска, занепакоеныя станам аўтобусных кішэняў і прыпынкаў, а гораду зусім не да гэтага, сталіца працягвае жыць сваім бурлівым жыццём. Вось за 50 крокаў ад нас гуляюць вяселле. Маладзіца кідае букет — і яго ловіць маленькая дзяўчынка. Яна падскоквае ад радасці і аддае букет сабаку. Усім весела і ўсе смяюцца. А на прыпынку спіць бяздомны. У падрапанай, не па сезоне вопратцы, з ускудлачанымі валасамі і сівой барадой, стары абдымае бутэльку і праз сон нешта мармыча сабе пад нос. І нікому да яго няма справы. Яго ўсе абмінаюць і стараюцца не заўважаць...

Вялікі горад.

## Чаму аўтобусы не водзяць жанчыны?

На кожным крузе — канцавы прыпынак. Пасажыры выходзяць, і ў нас вольны час у дзве-тры хвіліны. Перакур.

— Нядаўна былі з сям'ёй у ягадах, — дзеліцца навінамі наш кандуктар Святлана Хвісцюк. — Не сказаць, што багата, але трохі ёсць!

— Прывітанне калегам! — перапыняе размову вусаты мужчына з піўным жыватом. — Ну што, Фёдаравіч, як сёння — пашчасціла з надвор'ем?

Вусаты мужчына, як высветлілася, быў нашым калегам — таксама вадзіцель і таксама аўтобуса (паралельна з намі «на перакуры» стаяла яшчэ некалькі «130-х»).

— Ды што вы тут у выхадны дзень убачыце, — даведаўшыся, што за «стажор» сёння на лініі, пачынае мужчына з піўным жыватом. — Вось каб вы ў будны дзень, у час пік, ды на 81-м!.. Вось там сапраўдная катарга, а не праца. Мозг можа закіпець.

Мужчыны расказалі, чаму на аўтобусах зусім няма жанчын-кіроўцаў.

— Гэта вельмі цяжка і фізічна, і псіхалагічна. Летам, напрыклад, тэмпература ў кабіне кіроўцы дасягае 35—40 градусаў. Таксама пастаянная канцэнтрацыя ўвагі. Не, у жанчын павінна быць іншая місія...

— А ці здараюцца вясёлыя выпадкі? Ну, скажам, дзіцё можа ў аўтобусе нарадзілася? — дапытваюся ў Аляксандра, калі мы зноў селі ў аўтобус.

— Нараджалі, праўда, толькі не ў мяне, а ў калегі, — усміхаецца Аляксандр і працягвае: — А ўвогуле выпадкаў гэтых — кожны дзень, толькі і паспявай запісваць. Ехалі, памятаю, пасажыраў поўны аўтобус. А тут бабулька з казою. Сама яшчэ нішто сабе, залезла, а каза заўпарцілася і не ідзе. То трэба было бачыць, як бабуля запіхвала бедную жывёліну. Пад стогны і рогат пасажыраў, а запіхнула. Узгадваецца і яшчэ адзін выпадак. Было гэта яшчэ пры Саюзе. Зайшлі дзве сяброўкі. Адна пайшла месцы займаць, а другая трымала ў руках пакет з яйкамі, дык папрасілася прасунуць руку з пакетам у салон вадзіцеля — каб пасажыры не падушылі. І тут першая дзяўчына крычыць: «Лена, давай сюды: месца трымаю!» «Не магу, — адказвае другая. — Я тут у кіроўцы яйкі трымаю...».

## Будзьце дабрэйшымі...

Наша змена прайшла лёгка. Відаць, настрой мелі. Ужо па дарозе ў парк, калі ў аўтобусе нас зноў ехала трое (кіроўца, кандуктар і я), Аляксандр прыпыніўся на «зебры». Маладая дзяўчына на хвіліну спынілася і з нерашучасцю паглядзела на нас, прапусцім ці не. Аляксандр шырока ўсміхнуўся і кіўнуў галавой. Тая, пачырванеўшы, таксама ўсміхнулася і хуценька прадэфілявала па зебры.

— А яшчэ ў нашай працы галоўнае — дабрыня, — пасля паўзы дадаў Аляксандр. — І не будзе тады ніякіх канфліктаў...

**Ілья ЛАПАТО. Фота аўтара.**

КАМЕНТАРЫІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ:

**Сяргей СЫСОЕЎ, начальнік участка па ўтрыманні і добраўпарадкаванні вулічна-дарожнай сеткі Гаррамаўтадар па Фрунзенскім раёне**:

— Перад усталяваннем павільёнаў, іх месца размяшчэння ўзгадняецца з Мінсктрансам і ДАІ. Ёсць базавыя патрабаванні да павільёна: мінімальная адлегласць ад яго да борта праезнай часткі павінна складаць тры метры, ад табло з раскладам да павільёна таксама мінімум тры метры. Аднолькавае размяшчэнне павільёнаў, зразумела, не паўсюль. Тыя прыпынкі, што размешчаныя, напрыклад, у прыватным сектары, маюць невялікую ўмяшчальнасць. Таму там могуць змясціцца толькі невялікія лаўкі. На ўчастках, дзе назіраецца вялікі паток машын, мы ўсталёўваем некалькі павільёнаў. Усё залежыць ад канкрэтнага месца. Скаргі ад насельніцтва наконт размяшчэння прыпынкаў паступаюць. Іх разглядае выканкам, пасля накіроўвае да канкрэтных адрасатаў. Там ствараюцца адмысловыя камітэты, якія даюць аналіз сітуацыі і прымаюць рашэнні, ці пераносіць павільён бліжэй або далей.

**Уладзімір ЖАРАЛО, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве**:

— Калі мы хочам увесці асобную паласу, то трэба ўносіць змяненні ў Правілы дарожнага руху. Іх распрацоўкай займаецца МУС Беларусі. Пакуль жа з такімі прапановамі, наколькі я ведаю, ніхто з удзельнікаў дарожнага руху не звяртаўся. На маю думку, у нас гэта будзе не так проста зрабіць. Правілы павінны падыходзіць для ўсіх. Добра, мы паспрабуем гэта ў Мінску, добра, у Гомелі, дзе вузкія вуліцы. Але ў шэрагу гарадоў і мястэчак у гэтым проста няма неабходнасці. Ёсць такая практыка ў Лондане, дзе рух аднабаковы і для транспарту выдзелены левы бок дарогі. Ён нават пафарбаваны ў чырвоны колер (астатняя дарога — у сіні). Але ж праблем гэтая мера ўсё адно не вырашыць. Калі які аўтобус сапсуецца, ён перагароджвае дарогу іншым аўтобусам і атрымліваецца затор.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

## Рыбы стануць ініцыятарам новай справы, а Шалі зробяць яшчэ адзін крок у кар'еры

**АВЕН.** Пажадана звярнуць асаблівую ўвагу на псіхалагічныя праблемы, калі падаецца, што яны ёсць. Самыя простыя дзеянні, якія зроблены своечасова, дапамогуць умацаваць унутраны стрыжань. У пятніцу з'явіцца шанц нестандартнага рашэння старых праблем.

**ЦЯЛЕЦ.** Давядзецца многае ўпарадкаваць у самых розных жыццёвых сферах. Накіруйце энергію на стварэнне, асабліва калі разбурана ўжо больш чым дастаткова. За справядлівасць дазваляецца змагацца толькі мірнымі сродкамі. Зоркі чакаюць ад вас паслядоўнасці і цвёрдасці ў рашэннях.

**БЛІЗНЯТЫ.** З'явіцца магчымасць хутка і без стратаў разабрацца са складанымі сітуацыямі, якія ўзнікаюць. Аўторак стане на рэдкасць удалым днём: практычна не будзе перашкод для дасягнення любой мэты. У чацвер знойдуцца сілы для ажыццяўлення самых смелых рашэнняў.

**РАК.** Гэта не час для дэманстрацыі сваіх амбіцый. Самаўпэўненасць таксама можа стацца лішняй. Не патрабуйце вельмі многага ад навакольных. Пастарайцеся пазбягаць перанапружання на працы. Не рэкамендуецца звязваць сябе якімі-небудзь абяцаннямі — хутчэй за ўсё вы не зможаце іх выканаць па аб'ектыўных прычынах.

**ЛЕЎ.** Тыдзень дастаткова напружаны ў эмацыянальным плане, але вас будуць падтрымліваць сябры і родныя. У аўторак не варта паддавацца песімістычнаму настрою — ганіце прэч сумныя думкі. Не дазваляйце праблемам адбівацца на адносінах з акружаючымі: яны не павінны пакутаваць ад таго, што ў вас штосьці не ладзіцца.

**ДЗЕВА.** Каб пазбегнуць магчымых непрыемнасцяў, неабходна праяўляць сабранасць і ўраўнаважанасць. Спрыяльны час для самаадукацыі. Пастарайцеся не папасціся на вудачку авантурных праектаў: нічога, акрамя расчаравання і засмучэння, яны не прынясуць. Калі апынецеся ў тупіковай сітуацыі і не знойдзеце выйсця са становішча, якое склалася, можаце разлічваць на дапамогу сяброў.

**ШАЛІ.** Вы здольныя на здзяйсненні. Задачы, якія для іншых пададуцца звышскладанымі, вы вырашыце хутка і без асаблівых намаганняў. Пачынаецца паласа шанцавання. Вас будуць падтрымліваць не толькі сябры, але, у нейкай меры, і апаненты. Уласцівыя вам упартасць і працавітасць успрымуць на працы станоўча, што дазволіць зрабіць яшчэ адзін крок у кар'еры.

**СКАРПІЁН.** Выкарыстоўвайце сваю камунікабельнасць на сто працэнтаў — гэта дапаможа ў рэалізацыі планаў і задумаў. У аўторак будуць удалымі паездкі і камандзіроўкі. У сераду можаце скарыстацца дапамогай сяброў. Пятніца — вельмі ўдалы дзень для пабудовы падмурка будучых праектаў. Уважліва прыслухайцеся да парадаў родных.

**СТРАЛЕЦ.** Дзеля дасягнення мэты давядзецца ахвяраваць вольным часам і асабістымі планамі. Вас павінна натхняць тая акалічнасць, што ўсё, што робіце, пойдзе на карысць. У сераду варта ўзяць на сябе ролю адказнага каардынатара — вось тут у вас будзе процьма магчымасцяў праявіць таленты.

**КАЗЯРОГ.** Калі спрабуеце рабіць як лепш, а атрымліваецца, як заўсёды — гэта знак, што вы не зусім разумееце што насамрэч робіце. Не распыляйцеся, пастаўце сабе канкрэтную мэту. У першай палове тыдня добра падарожнічаць і прымаць гасцей. Не выключана, што ў суботу давядзецца працаваць, затое ў нядзелю павесяліцеся ад душы.

**ВАДАЛЕЙ.** Усё добрае прыйдзе да вас само — і нават рыхтавацца да гэтага неабавязкова, насупраць, мітуснёй можаце спудзіць удачу. Настае час актыўных дзеянняў. Нават не заўважыце, як лёгка справіцеся з абавязкамі, якія на вас ускладаюць. У другой палове тыдня верагодны паездкі, сустрэчы з цікавымі людзьмі і мноства магчымасцяў сумясціць прыемнае з карысным.

**РЫБЫ.** Зможаце арганізаваць навакольных на перспектыўную агульную справу, аднак без вашага асабістага ўдзелу ўсё пагражае рассыпацца, так што толькі арганізатарам пабыць не ўдасца. Будзьце больш асцярожныя ў словах: можаце міжволі пазбавіць спакою і сну кагосьці з блізкіх людзей. Вашы асабістыя поспехі прыводзяць у захапленне сяброў і выклікаюць зайздрасць у нядобразычліўцаў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ЭКРАН»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже изолированных помещений, расположенных по адресу: г. Борисов, ул. Полка Нормандия-Неман, 167:**

**Лот № 1** – изолированное помещение № 2 столовой, об. пл. 1062,8 кв.м. Начальная цена с НДС – 430 346 000 бел. руб. **Лот № 2:** изолированное помещение № 3 столовой, об. пл. 1505,1 кв.м. Начальная цена с НДС – 575 604 000 бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.07.2009 г. Аукцион состоится **02.09.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **01.09.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел. (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

Коллектив открытого акционерного страхового общества «БАГАЧ» выражает глубокое соболезнование родным и близким Поляка И.А. в связи с постигшим их горем — безвременной смертью **Поляка Ивана Арсеньевича**.

# КРЫЖАВАНКА



**Па гарызанталі:** 1. Суботні адпачынак у іудзеяў. 7. Кашападобная лёдавая маса на рацэ перад ледаставам. 11. Дзікі конь у амерыканскіх прэрыях (стэпах). 13. Сталярны інструмент для стругання дрэва. 14. Вуздэчка без цугляў. 15. Футарал з прыладамі шаўца. 16. Здымак з гравюры. 18. Конь для іпадрома. 19. Ім расцягваюць бярвёны зруба пры пажары. 21. Элемент пункціру. 24. Мера масы каштоўных камянёў. 27. Украінскі народны шматструнны муз. інструмент. 29. Высушаныя палоскі з пшанічнага цеста. 30. Стымулюючае рэчыва, якое выдзяляецца наднырка-вымі залозамі. 31. Стан павышанай псіхічнай узбуджанасці. 32. Скрутак суцэльнага палатна. 33. Двухколая павозка для спаборніцтваў даўней у рымлян. 35. Мінерал, сыравіна для атрымання ртуці. 36. Імя беларускай паэтэсы Лось. 37. Орган, забяспечваючы рух часткі цела істоты. 41. Узвышэнне перад іканастасам у царкве. 42. Перавернуты пласт зямлі. 46. Голуб, які мае здольнасць куляцца пры палёце. 48. Алей з насення клешчавіны. 49. Сутыкненне супрацьлеглых інтарэсаў. 50. Музычная п'еса з урыўкаў агульнавядомых мелодый. 51. Накладная планка вакол дзвярнога праёма. 52. Прадмет сталовага прыбора. 53. Жоўты цукровы пясок нізкай якасці. 54. Папярочная лаўка на вёсельным судне.

**Па вертыкалі:** 2. Вочная ўпадзіна. 3. Залішняя самаўпэўненасць у гутарцы. 4. Прыгожая дарожная скрынка. 5. Стан ахоўнага напружання арганізма. 6. Запаленне слізістай абалонкі тонкіх кішак. 8. Лекавая і дэкаратыўная складанакветкавая расліна. 9. Раздзел фізікі пра ўласцівасці святла. 10. Прыгожае пяро ў жаночым капелюшы. 12. Яйцы матыля шаўкапрада. 17. Мяккі пахучы касметычны парашок. 18. Змяненне назоўніка флексіямі. 20. Узаемная сувязь прадметаў, паняццяў. 21. Праваслаўны абрад памінання нябожчыкаў на могілках. 22. Аранжава-жоўты раслінны пігмент. 23. Абмежаваная пэўнымі абставінамі частка жыцця. 25. Захады па перавыхаванні латругі. 26. Слова, супрацьлеглае па значэнні другому слову. 28. Вадкая частка гатаванай стравы. 29. Восеньскае покрыва зямлі ў лесе. 33. Марская выдра. 34. Работнік у кашары. 37. Землямер. 38. Бессямейны адзінокі мужчына. 39. Тэмп руху пры яздзе на кані. 40. След ад уколу іголкай ці цыркулем. 41. Мудрагелістая канструкцыя замка. 43. Белая пляма на лбе каровы. 44. Канаўка сцёку вады. 45. Адбітак відарыса на паверхні металічнага вырабу. 47. Кіраўнік грамадска-палітычнай арганізацыі.

**Склаў Уладзімір ДЗЕМЧАНКА.**

## ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд (18 жніўня). Па гарызанталі:** Камбайн. Азон. Хата. Насос. Шар. Сноп. Арышт. Лато. Манарх. Абарот. Дан. Тара. Сабака. Абсада. Лом. Плуг. Астана. Атрад. Фас. Ава. Піка. Юта. Драп. Трум. Опус. Сага. Трактарыст. **Па вертыкалі:** Ліпень. Каравай. Старт. Спрыт. Арала. Стаер. Дуда. Ачаг. Шах. Падрост. Архар. Рупар. Ніз. Арык. Фрамуга. Ост. Сак. Сон. Астат. Аса. Марс. Холад. Тып. Парабала. Тон. Конік. Грот. Рама. Атлант.

**Сканворд (19 жніўня). Па гарызанталі:** Пласт. Баяніст. Мячэць. Ракада. Гара. Раб. Бос. Шво. Анёл. «Галатэя». Рэй. Кірха. Туша. Скала. Талака. Абраза. Рой. Бор. Скунс. Кімано. Ікс. Матка. Пракат. Айва. Арэлі. Спод. Ата. Рыс. Легенда. **Па вертыкалі:** Сінагога. Царква. Ролік. Алабама. Стол. Зона. Сом. Абарот. Армяк. Курс. Чака. Эпас. Абшар. Плот. Цуд. Ідал. Язь. Абора. Сіп. Маяк. Сайт. Ударнік. Ёрш. Коска. Касцёл. Абай. Сталіца.

**Сканворд (20 жніўня). Па гарызанталі:** Еўтушэнка. Піхта. Барс. Дэліб. Вір. Тора. Асоба. Указ. Ледакол. Рэбус. Адам. Раўт. Секанс. Смута. Век. Улар. Анкара. Кулак. Бук. Тур. Трап. Ежа. Адан. Ясак. Ачаг. Улада. Айтматаў. **Па вертыкалі:** Ахмадуліна. Ікс. Лідар. Муляж. Акула. Быкаў. Такт. Твар. Вал. Красала. Ірбіс. Дача. Нюх. Арол. Блакада. Тор. Гай. Старт. Акт. Керн. Труба. Кіт. Акуджава. Аса. Нерпа. Бэз. Маска. Прыліў.

## НАЙСТАРЭЙШАЙ ЖЫХАРЦЫ МІНСКА КЛАЎДЗІІ ЯКІМОВІЧ ДНЯМІ СПОЎНІЛАСЯ 115 ГАДОЎ

Пра гэта паведамілі ў камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. Доўгажыхарка пражывае ў Маскоўскім раёне сталіцы з 72-гадовай дачкой і зяцем. У бабулі трое дзяцей, пяцёра ўнукаў, шэсць праўнукаў і адна прапраўнучка. У пашпарце Клаўдзіі Аляксееўны пазначана дата нараджэння — 20 жніўня 1894 года. Блізкія самай старэйшай мінчанкі расказалі, што ў апошнія гады паважны ўзрост даецца ў знакі: яна амаль не выходзіць гуляць на вуліцу, перасоўваецца з дапамогай кійка або блізкіх.

**Аксана ШЫКУЦЬ,** *БЕЛТА.*

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

ИНФОРМИРУЕТ

В извещение о проведении 31 августа 2009 года 90-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска (газета «Звязда» от 20 августа 2009 г.) вносятся следующие изменения: в позиции 78 (лот № 78) во второй графе вместо «…(под торговый объект продовольственной, непродовольственной группы товаров)» — **читать «(под пункт обмена валют)»**; **исключить из публикации позицию 28, лот № 28.**

**Телефон для справок 227 40 22.**

**г. ВИТЕБСК** **24.09.2009**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Капитальное строение (здание административно-хозяйственное) с инвентарным номером 233/С-930, расположенное по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, Лукомольское шоссе, 4, и право заключения договора аренды земельного участка. Продавец: РУП «Витебскэнерго», тел. (0212) 47 52 99 | **ЦЕНА ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 20 %.** Характеристика объекта недвижимости: здание трехэтажное кирпичное, 1974 г. постройки, фундамент бетонный, перекрытия железобетонные; крыша рулонная совмещенная, центральные водопровод, канализация, общая площадь 1681,9 кв.м. Асфальтобетонное покрытие площадью 148 кв.м, цементобетонное покрытие территории 66 кв.м, деревья лиственные в количестве 16 единиц. Земельный участок: площадью 0,2299 га, кадастровый номер 225151000002000096, срок аренды участка – 58 лет, назначение – для содержания и обслуживания здания. Ограничение в использовании в связи с расположением в водоохранной зоне озера Лукомльское вне прибрежной полосы. | 511 797 896 | 51 179 789 |

ОРГАНИЗАТОР: фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

**Условия пользования земельным участком:**

заключение победителем аукциона с Чашникским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в течение двух месяцев со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок в Новолукомльском бюро Лепельского филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения Чашникского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год;

осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

**1. Аукцион состоится 24 сентября 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

**Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 23 сентября 2009 г. до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 24.09.2009 г. с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

6. **Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; **не позднее 10 дней** со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы в сумме 3-х миллионов рублей, связанные с организацией и проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе изменением и прекращением существования земельного участка и государственной регистрацией в отношении создания земельных участков; **не позднее 12 дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

